# 2024 год

# ЮБІЛЕЙ ПЕРШАГА ВЫДАННЯ

Звесткі з архіва
Нацыянальнай кніжнай палаты Беларусі

***Кніга, як і чалавек, мае дату нараджэння – год, калі яна ўпершыню была апублікавана. І, канешне, у кніг бываюць юбілеі, а яны, як вядома, з’яўляюцца своеасаблівымі каталізатарамі ўспамінаў і служаць нагодай для таго, каб звярнуць увагу на выдатныя старонкі гісторыі літаратуры і кнігадрукавання і ўвогуле ацаніць «базу даных» культурнай спадчыны, асэнсаваць яе ўнікальнасць.***

***У гэтай рубрыцы прадстаўлена інфармацыя аб мастацкіх творах класікаў беларускай літаратуры, першыя выданні якіх захоўваюцца ў архіве Нацыянальнай кніжнай палаты Беларусі і для якіх 2024 год з’яўляецца юбілейным.***

# 50 гадоў

**Гілевіч, Н. Як я вучыўся жыць: гумар і сатыра / Ніл Гілевіч. – Мінск : Мастацкая літаратура, 1974. – 140, [2] с.**



Кніга Ніла Сымонавіча Гілевіча (1931–2016) «Як я вучыўся жыць» – гэта зборнік гратэскава-камічных вершаваных разнажанравых твораў, напісаных на пачатку 1970-х гадоў.






Зборнік быў здадзены ў набор 30.08.1973, падпісаны да друку 30.11.1973.
Кніга выйшла тыражом у 5 000 экзэмпляраў, мела невялікі фармат (70х100), была аздоблена супервокладкай і ілюстрацыямі, выкананымі Чурко Л. В. (1931–1983).

B. Busquet

# «Як я вучыўся жыць» : 50 гадоў




Зборнік падзелены на чатыры раздзелы, у кожным з якіх высмейваюцца такія заганы чалавечага характару, як ашуканства, крывадушша, чэрствасць, п’янства, хабарніцтва.

Першы раздзел «Як я вучыўся жыць» уключае чатыры сюжэтна-апавядальныя вершаваныя творы: «Як я рашыў набыць машыну», у якім сябе могуць распазнаць аўтамабілісты, што «баяцца» прыйсці на дапамогу на дарозе; «Як я ўцягнуўся», у якім прасочваецца шлях да п’янства ад першай «кропелькі» ў дзяцінстве; «Як я адпачываў» і загалоўны твор «Як я вучыўся жыць», у якіх аўтар высмейвае прыстасаванцаў і прайдзісветаў, што «умеюць жыць», хоць і не надта могуць «глуздамі варушыць».

B. Busquet

# «Як я вучыўся жыць» : 50 гадоў







У раздзеле «Кантора» змешчаны аднайменная сучасная ланцужковая казка «Кантора», а таксама творы «Шаманы», «Ода футбольнаму мячу», «Прамова цёткі Матруны з высокай трыбуны», «Зона купання», «Расказ службовага шафёра».

Раздзел «Песенькі вясёлага Бурціна» ўключае «Песеньку здзіўлення», «Купіце дзіцяці цацку!», «Песеньку пра дабрату», «Што запеў Бураціна, паспытаўшы гарэлкі», «І ля Гжацка і ля Шацка».

B. Busquet

# «Як я вучыўся жыць» : 50 гадоў




У раздзел «На парнаскай дарозе» ўвахозяць такія творы, як «Занадта сярдзітаму крытыку», «Адказ крытыка…», «Кашмар (*жарт*)», «На чым лепшыя вершы?», «Каханне, верш аб ім і «дзед-рэдактар», «Непераборлівы (*байка*)», «Рыфмы-забавы (*з нізкі «Пераплюнем фокуснікаў»*). У гэтым жа раздзеле змешчана *паэма-камедыя* «Формула іржавіны», якая, па меркаванні літаратурных крытыкаў, належыць да вяршынных дасягненняў Гілевіча-сатырыка.

У творах зборніка Ніл Гілевіч па-майстэрску і бліскуча малюе запамінальныя тыпы прайдох ад навукі, культуры, літаратуры, хапуг, кар'ерыстаў, бюракратаў, пустазвонаў.

Кніга «Як я вучыўся жыць» пазней не перавыдавалася, але творы з яе рэгулярна ўключаліся ў іншыя зборнікі Ніла Гілевіча, а на аснове раздзела «Кантора» ў 1989 годзе быў выдадзены цэлы зборнік з такой жа назвай.

B. Busquet

# «Як я вучыўся жыць» : 50 гадоў

*«Ва ўсім, што трапляецца пад сатырычны прыцэл паэта, у кожным яго вобразе мы адчуваем прысутнасць народнага погляду на жыццё, непасрэднасць бачання фактаў, размоўную шчырасць інтанацый, якая так натуральна і ёміста выяўляе характары самых розных персанажаў.*

*Адной з характэрных асаблівасцей сатыры і гумару Н. Гілевіча з'яўляецца іх блізкасць да фальклору. Гэта адчуваецца і ў дасціпнасці моўных сродкаў, і ў спосабе абмалёўкі вобразаў, і ў прыёмах кампазіцыйнай арганізацыі жыццёвага матэрыялу... Уражанне ўзмацняецца той сапраўды чароўнай моўнай стыхіяй, той слоўнай вынаходлівасцю, у якой паэт, здаецца, невычэрпны».*

Пятрусь Макаль («Полымя», 1974, № 11)

B. Busquet